Грынчык М.М.,
докт.філал. навук,
прафесар

## З КАГОРТЫ ПАЧЫНАЛЬНІКАЎ

У магутнай плеядзе беларускіх адраджэнцаў пач. XX ст. Ядвігіну Ш. (Антону Лявіцкаму) належыць асобнае месца. Аўтар таленавітых сацыяльнафіласофскіх навел і эцюдаў, першага беларускага рамана, вядомы эсэіст і публіцыст, ён пакінуў багатую літаратурную спадчыну, якая стала жывым злучывам паміж двума пакаленнямі беларускіх творцаў канца XIX і пачатку XX ст. Ядвігін Ш. -- пачынальнік і ініцыятар разгортвання масавай культурнаасветніцкай працы сярод студэнцкай моладзі. Неацэнная яго актыўная дзейнасць у рэдкалегіях першых беларускіх газет і часопісаў («Наша доля», «Наша ніва», «Маладая Беларусь», «Саха» і інш.). Вось чаму спадчына пісьменніка, які так непарыўна звязаны з беларускай ідэяй, пісьменніка, які стаяў ля самых вытокаў нацыянальнага адраджэння яшчэ ў канцы XIX ст., павінна быць даследавана занава і разгледжана ў кантэксце тагачасных культуралагічных і грамадскіх з'яў і працэсаў.

Па-першае, Ядвігін Ш. -- адзін з пачынальнікаў нацыянальна-вызвалечага руху на Беларусі. Працягваючы ідэі К.Каліноўскага і Ф.Багушэвіча, ён адзін з першых стаў ініцыятарам арганізаванае працы сярод беларускага студэнцтва ў Маскве. Паралельна з В.Іваноўскім у Пецярбурзе ён ствараў гурткі патрыятычна настроенай моладзі і імкнуўся прыдаць гэтаму стыхійнаму руху мэтанакіраваны палітычны характар. Ці ж не сімвалічна, што адзін з першых такіх гурткоў узнік у змрочных мурах Бутыркі, дзе свае пакутлівыя «універсітэты» прайшло не адно пакаленне беларускіх патрыётаў? У сваіх «Успамінах» Ядвігін Ш. адзначаў: «Першымі найважнейшымі пастановамі на гэтых нарадах былі: 1) заснаваць тут жа -- у Бутырках -- першы беларускі гурток моладзі ў Маскве; 2) якім бы то ні было спосабам -- легальным ці не легальным -- тварыць беларускае друкаванае слова; 3) падчас летніх вакацыяў ісці ў беларускі народ -- будзіць і пашыраць яго нацыянальную свядомасць; 4) знайсці ў Маскве канспіратыўную кватэру, дзе можна было б перыядычна збірацца на нарады аб далейшай сваёй працы» (Ядвігін Ш. Выбраныя творы. -- Мн., 1976. -- С. 288).

Менавіта ў такіх гуртках Масквы, Петраграда, Дэрпта і інш. зараджаліся першыя «сны аб Беларусі», новай, адроджанай, незалежнай.

Другі не менш істотны факт у біяграфіі Ядвігіна Ш. -- сустрэча з маладым паэтам з Вязынкі Януком Луцэвічам (будучым Я.Купалам) у Радашковічах. Тут нарэшце былі закончаны даволі працяглыя пошукі пачынаючага паэта, быў канчаткова вызначаны ягоны творчы лёс і напрамак. Разам з доктарам Я.Офэнбергам Ядвігін Ш. пачынае актыўную працу сярод мясцовай моладзі, арганізуе літаратурныя вечары, пастаноўкі, наладжвае плённую працу па збіранню нацыянальных творчых сіл у Беларусі і далёка за яе межамі (М.Янчук, А.Уласаў і інш.).

Даволі значны ўклад Ядвігіна Ш. у развіццё жанравых форм беларускай літаратуры пач. XX ст. Будучы па складу свайго таленту «кроўным баечнікам» (М.Багдановіч), г.зн. прыроджаным байкапісцам, ён стварыў шэраг сацыяльна-бытавых і філасофскіх твораў, прасякнутых глыбокім гуманізмам, шчырым спачуваннем людскому гору, пошукамі новых маральнаэтычных і грамадскіх асноў жыцця. У іх цэнтры сумленнасць і шчырасць, захаванне нацыянальнай самабытнасці, вернасць традыцыям, гістарычная памяць народа (паэма «Дзед Завала»).

Асаблівае месца ў беларускай літаратуры пач. XX ст. займае сацыяльна-філасофскі раман Ядвігіна Ш. «Золата» (1920 г.). Лёс маладой вясковай сям'і Васіля Дубінскага і Зосі Стрончык прадвызначаны парушэннем адвечных маральных устояў, гэта па сутнасці «кара за грахі», за адступленне ад гуманістычных традыцый народа. Раман «Золата» каштоўны тым, што рэалістычна адлюстраваў некаторыя актуальныя праблемы вясковага жыцця, у прыватнасці ранняй беларускай эміграцыі. Усё гэта дае падставу станоўча ацаніць творчую спадчыну Ядвігіна Ш., яго выключна плённы ўплыў на многія сферы адраджэнскага руху ў Беларусі.

Пацыенка А.М.,
канд.пед. навук,
дацэнт

## З ГІСТОРЫІ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

Першыя школы на тэрыторыі Беларусі з'явіліся яшчэ ў XI стагоддзі. Прыкладам адной з іх з'яўляецца школа, створаная Ефрасінняй Полацкай. Школы і вучылішчы па тыпу заходніх былі ўведзены ў XIV ст. Яны ствараліся пры саборах, касцёлах і іншых рэлігійных установах.

Сваіх вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага не было, і, каб атрымаць вышэйшую адукацыю, трэба было ехаць на Захад -- у Польшчу, Італію, Германію і іншыя краіны. Напрыклад, знакаміты наш зямляк Ф.Скарына вучыўся ў Кракаўскім і Падуанскім універсітэтах. У 1545 годзе прускі герцаг Альбрэхт увёў у Кёнігсбергскім універсітэце стыпендыі для 8 студэнтаў Вялікага княства Літоўскага, якія хацелі атрымаць лютэранскае духоўнае званне. З таго часу ў Кёнігсбергскім універсітэце вучылася значная колькасць беларусаў.

У 1569 годзе ў Вільню былі запрошаны езуіты, якія заснавалі тут свой калегіум. У 1570 годзе яны ўрачыста адкрылі гімназію, якую ў 1579 г. кароль Стэфан Баторый перайменаваў у акадэмію. Першым рэктарам акадэміі быў прызначаны выдатны царкоў-

на-рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай Пётр Скарга. Навучанне ў акадэміі было бясплатным.

У XVI ст. тут вучыліся 700 студэнтаў і працавалі 54 выкладчыкі. У XVII ст. колькасць студэнтаў павялічылася да 1200 чалавек, а выкладчыкаў да 75.

Для спаборніцтва ў вучобе лепшым студэнтам прысвойвалі тытулы імператараў, цэсараў, прэфектаў. У якасці ўзнагарод уручаліся медалі, кнігі, выявы святых і інш. Для пакарання адстаючым студэнтам адзявалі аслінныя шапкі са званочкамі, саджалі ў карцэр, падвяргалі цялесным карам: прафесар мог наказаць 3 --5 ударамі палкі, прэфект (прарэктар) ад 10 да 15. Але калі маладыя прафесары перавышалі сваю ўладу, іх саміх падвяргалі цялеснай кары.

Пры універсітэце быў закладзены цудоўны батанічны сад, працавала багацейшая для таго часу бібліятэка. Пачаткам для стварэння бібліятэкі паслужыла кнігасховішча Сігізмунда - Аўгуста, якое заключала ў сабе ўсё, што ў яго час было надрукавана на ўсіх мовах. Акрамя таго, Сігізмунд перадаў бібліятэцы шмат рукапісаў. Другім вядомым мецэнатам бібліятэкі быў віленскі епіскап Пратасевіч. Іх прыкладу наследавалі іншыя. Леў Сапега падараваў 3000 кніг. Поўны збор кніг бібліятэкі складаў звыш 60 тыс.

У 1803 г. імператар Аляксандр I перайменаваў Віленскую акадэмію ў імператарскі універсітэт. Тут працавалі 4 факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычны (з багаслоўем) і літаратурны.

У XIX ст. еўрапейская частка Расіі была падзелена на 6 навучальных акруг. Беларускія губерні ўвайшлі ў склад Віленскай. Вучэбным, адміністрацыйным і культурным цэнтрам акругі стаў Віленскі універсітэт. Яму былі падначалены ўсе навучальныя ўстановы: гімназіі, акружныя вучылішчы, павятовыя і прыхадскія школы, прыватныя вучылішчы і пансіёны.

У пачатку XIX ст. студэнты універсітэта прымалі актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху. Яны стваралі тайныя патрыятычныя таварыствы філаматаў і філарэтаў, падтрымлівалі паўстанне 1830--1831 гг.

У 1828 г. універсітэт святкаваў 250-гадовы юбілей, а ў 1832 г. за ўдзел студэнтаў у паўстанні быў закрыты. Пачалася ўзмоцненая русіфікацыя насельніцтва краю. Была ліквідавана Віленская навучальная акруга, закрыты 190 каталіцкіх манастыроў і ўсе школы, якія пры іх існавалі, значна скарацілася сетка навучальных установ. У Беларусі не засталося ні адной вышэйшай навучальнай установы.

У 1833 г. руская мова на тэрыторыі Беларусі была ўведзена ў якасці дзяржаўнай.

Грыцкевіч А.П.,
докт.гіст. навук,
прафесар

## ПАДРЫХТОЎКА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ

Цяжкая для Беларуска - Літоўскай дзяржавы вайна, пагроза заваёвы тэрыторыі Беларусі войскамі цара Івана IV Жахлівага паставілі ў парадак дня пытанне аб больш цесным саюзе Вялікага княства Літоўскага з Польскім каралеўствам.

Сярод саслоўя феадалаў не было адзінства ў гэтым пытанні. Верхавіна саслоўя, магнаты, не згаджаліся на аб'яднанне з Польшчай, бо бачылі ў гэтым пагрозу незалежнасці дзяржавы, пагрозу сваім інтарэсам у кіраванні ёю, не хацелі дзяліць уладу з польскімі магнатамі. Яны разлічвалі, што здолеюць сваімі сіламі абараніць дзяржаву ад маскоўскай пагрозы.

Асноўная частка класа феадалаў -- сярэдняя і дробная шляхта -- не бачыла такога выхаду. Вайна для яе была вялікім цяжарам, і шляхта шукала саюзніка ў Польшчы. Беларуская шляхта была супраць далучэння яе тэрыторыі да Маскоўскага царства і ўсімі сіламі змагалася супраць маскоўскай агрэсіі. Перспектыву далучэння да Расіі яна не ўспрымала, таму што ў Беларуска - Літоўскай дзяржаве правы шляхты былі значна большымі, чым у дваран у Маскоўскай дзяржаве, у тым ліку маёмасныя. У Вялікім княстве Літоўскім шляхта карысталася асабістай недатыкальнасцю, чаго не было ў Маскоўскай дзяржаве. Праз некалькі год шляхта дамаглася мясцовага самакіравання (соймікі ў паветах і выбіраемыя суды) і яшчэ раней замацавала свае права выбіраць у сойм. Тут не было самадзяржаўнага рэжыму, як у Маскоўскай дзяржаве. Шляхта бараніла сваю зямлю, свой народ, зыходзячы са старадаўняй патрыятычнай пазіцыі.

Ужо 13 верасня 1562 г. пасля паходу і перад роспускам вайсковага апалчэння шляхта Беларусі ў ваенным лагеры ля Віцебска прыняла акт і накіравала яго ў Вільню да вялікага князя заключыць унію з Польшчай, каб мець агульныя соймы з польскай шляхтай, разам выбіраць караля і, галоўнае, карыстацца аднолькавымі правамі з польскай шляхтай (у якой было яшчэ больш правоў) і разам абараняцца ад ворагаў. Беларуская шляхта звярнулася з гэтым да жамойцкай шляхты, якой у вайсковым лагеры не было. Такім чынам, беларуская шляхта была ініцыятарам уніі. Беларускія і літоўскія магнаты на чале з Мікалаем Янавічам Радзівілам, віленскім ваяводай, канцлерам і маршалкам земскім, выступілі супраць уніі з Польшчай. Таму рашэнне пытання аб уніі зацягнулася на некалькі гадоў.

Віленскі сойм 1563 г. узнавіў разгляд гэтага пытання. Была вылучана дэлегацыя (разам з прадстаўнікамі магнатаў) на перагаворы з Польшчай аб уніі. Наказ сойма сваёй дэлегацыі быў у многіх пунктах падобны на акт Віцебскага палявога сойму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ